■ Разважанні пра сучаснасць

# НЕ БУЛЬБАЙ АДЗІНАЙ

## Пра гаспадарку «Брылёва», якую ўзначальвае славуты Аркадзь КОБРУСЕЎ, жартам гавораць, што яблыкі тут растуць паміж шматпавярховікаў, а кароў гадуюць на асфальце

**Дарэчы, усё гэта недалёка ад ісціны. Сапраўды, жыллёвыя гмахі Чыгуначнага раёна Гомеля — праз пуці, а ўмовы, у якіх жывуць вяскоўцы аграгарадка Мічурынскае, — менавіта гарадскія. Пры гэтым надоі малака на карову амаль такія, як у Ізраілі (болей за 9 тысяч кілаграмаў), а ўраджайнасць гародніны дасягае еўрапейскага ўзроўню.**



ДАСЯГНЕННІ Аркадзя Тарасавіча можна пералічваць і інакш. Званне заслужанага работніка сельскай гаспадаркі БССР і Зорку Героя Сацыялістычнай працы ён атрымаў яшчэ пры савецкай уладзе. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Чырвонага сцяга, ордэнам «Знак Пашаны», ён з'яўляецца ганаровым грамадзянінам Гомельскага раёна... Між тым ад гука медных труб галава не закружылася і сёння: у свае 78 гадоў у будучыню глядзіць упэўнена і разважае пра тое, куды далей гаспадарка будзе крочыць. Побач — каманда, якая стваралася не за год, і падтрымка самых блізкіх людзей, праверaных часам і пачуццямі.

Апошняе тычыцца ў тым ліку яго вернай спадарожніцы — жонкі. Калі Аркадзь Тарасавіч узгадвае пра яе, нават інтанацыя мяняецца. Паважліва так называе: «мая Марыя Аляксееўна». Дарэчы, у сямейным жыцці таксама адны дасягненні. Сын Саша — генерал міліцыі, па службовай лесвіцы вырас да намесніка міністра ўнутраных спраў Беларусі. Дачкой Ларысай таксама ганарыцца. Яна пайшла па матуліных слядах — цяпер узначальвае гастраэнтэралагічнае аддзяленне гомельскай бальніцы №3. Марыя Аляксееўна ўсё жыццё працавала аперацыйнай медсястрой і калісьці ў канцы 1950-х літаральна выхадзіла маладога Аркадзя, які на два з паловай года трапіў на бальнічную койку пасля аўтамабільнай аварыі. Праз 19 гадоў ёй яшчэ раз прыйшлося выцягваць мужа з таго свету. Вось тады адчуў ён сапраўдную каштоўнасць крохкага жыцця і жаданне паспець зрабіць нешта карыснае для людзей.

ВЫПРАБАВАННІ Аркадзь Тарасавіч праходзіў разам з краінай. Самымі складанымі, гаворыць, былі тыя часы, калі адна дзяржава развалілася, а іншая толькі нараджалася. Між тым старшынёй гаспадаркі «Брылёва» ён стаў яшчэ пры СССР, у 1979 годзе. Тады саўгас «Брылёва» застаўся без кіраўніка, і Аркадзь Кобрусеў, які да гэтага працаваў начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі Гомельскага райвыканкама, узначаліў прадпрыемства са складанай спецыялізацыяй. Тады ў «Брылёва» з-за адсутнасці сховішча для гародніны з восені яе прадавалі па непрыбытковых коштах. Машынна-трактарны парк састарэў, ураджайнасць пакідала жадаць лепшага. Супрацоўнікі востра адчувалі дэфіцыт жылля... Што казаць, лёгка не было.

**«Самае галоўнае, што ў тыя гады не былі разбураны калгасы і саўгасы. Тады многія прапанавалі іх распусціць, як гэта было зроблена ва Украіне. Калі б мы пайшлі па гэтаму шляху, поспеху не было б».**

Калі ж Аркадзь Кобрусеў згадвае пра разбураную на пачатку 1990-х прамысловасць і беспрацоўе, у яго голасе горыч:

— Я пра ўсё гэта ведаю лепш, чым хто іншы. За 20 апошніх гадоў зроблена немагчымае. Калі адбыўся развал краіны, былі разбураны ўсе сувязі. І хоць мы, у адрозненне ад многіх, не дапускалі кардынальнага спаду, нават у горшыя часіны не залазілі ў крэдыты, штомесячна плацілі зарплату і аванс ва ўстаноўленыя тэрміны, цяжка прыходзілася і нам. Збіралі людзей і тлумачылі ім, што жыць трэба па тых сродках, што ёсць на гэты момант. Менавіта тады кіраўнік дзяржавы прыняў некалькі дырэктыў, якія дапамаглі вырашыць пытанні навядзення парадку і дысцыпліны. Самае галоўнае, што ў тыя гады не былі разбураны калгасы і саўгасы. Тады многія прапанавалі іх распусціць, як гэта было зроблена ва Украіне. Калі б мы пайшлі па гэтаму шляху, поспеху не было б. Трэба было ўмацоўваць дзяржаўныя гаспадаркі. Каб людзі працавалі, каб павялічвалася валавая вытворчасць прадукцыі, каб з'яўляліся сродкі для развіцця. Паступова аднаўляліся сувязі з расійскімі рэгіёнамі, адкрываліся новыя вытворчасці, з'яўлялася перспектыва ў людзей, якія карміліся ад зямлі.

ВОСЬ вынік. Акрамя традыцыйных відаў гародніны (морква, капуста, буракі, агуркі, таматы), у «Брылёва» цяпер вырошчваюць спаржавую фасолю, салодкі перац, розныя віды капусты. На працягу апошніх 10 гадоў КСУП «Брылёва» займае

**«У школьным сачыненні шмат гадоў таму агучыў сваю мару: быць старшынёй. Атрымалася».**

першае месца ў краіне па вытворчасці гародніны адкрытага грунту.

— Цяпліччны камбінат плошчай 9,5 гектара і сёння застаецца эканамічнай апорай прадпрыемства, а яблыневы сад перажывае новае нараджэнне. На плошчы 85 гектараў выраслі маладыя дрэвы на карлікавым прышчэпе. Пабудаваныя сховішчы добра захоўваюць ураджай і забяспечваюць гамяльчан і жыхароў вобласці свежай гароднінай і садавінай круглы год. Вялікая частка прадукцыі — у першую чаргу спаржавая фасоля і зялёны гарошак — перапрацоўваецца на ўласным кансервавым заводзе з самым сучасным абсталяваннем, дзе выпускаецца некалькі відаў сумесяў замарожанай гародніны. Шмат гэтай прадукцыі ідзе на экспарт, — адначае Аркадзь Кобрусеў. — Да нас у гаспадарку на рэспубліканскі семінар «Дзень поля» прыязджаюць замежныя спецыялісты з розных краін. Мы пастаянна эксперыментуем з насеннем найлепшых гатункаў з Галандыі, Даніі, Японіі... Без адсочвання і ўкаранення новых тэхналогій і новых гатункаў не будзе прагрэсу. Для гэтага патрэбна і адпаведная культура земляробства. Усё разам забяспечвае атрыманне такой высокай ураджайнасці.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведваў сельгаспрадпрыемства двойчы: у 1996 і ў 2008 гадах. Тым, што пабачыў на свае вочы, застаўся задаволены. Цікавілюся, якую культуру ў «Брылёва» засвоіць і прапануюць спажыўцу наступнай.

— Ананасы, — усміхаецца дырэктар «Брылёва», — пакуль не збіраемся вырошчваць. І кавуны таксама, бо нявыгадна. Кожнай культуры трэба пэўная колькасць цяпла. Калі яго няма, расліна не паспявае поўнасцю. Мы вырошчваем памідоры, і, вядома, хацелася б рабіць з іх сок і кансерваваць у ім. Але ж наш тамат не мае столькі сухіх рэчываў, колькі, напрыклад, краснадарскі. Таму ўсё трэба пралічваць і рабіць разумна. Пакуль мы застаёмся на традыцыйных культурах, якія ўжо засвоілі, але пайшлі на пашырэнне плошчаў пад цыбулю, гатункі якой будуць змяняцца.

ПРА створаную за гады сацыяльную структуру Аркадзь Тарасавіч гаворыць з асаблівай любоўю. Прыярытэтам для яго заўсёды з'яўляюцца людзі, побач з якімі жыве і працуе:

— Усе нашы работнікі жывуць цяпер у гарадскіх умовах. Мы за гэтыя гады вельмі шмат пабудавалі. Толькі кватэр — каля 800. Усё тут ёсць: гімназія з музычна-харавым ухілам, дзіцячы сад-яслі з басейнам, сельскі дом культуры, медыцынская амбулаторыя агульнай практыкі, кавярня-сталовая, лазнева-пральны камбінат і новая крама. Па просьбе жыхароў вёскі і з дапамогай іх ахвяраванняў пабудавана царква ў гонар іконы Казанскай Божай Маці.

— Людзі, — гаворыць Аркадзь Кобрусеў, — самая галоўная каштоўнасць сельгаспрадпрыемства.

Вядучых спецыялістаў кіраўнік імкнецца пастаянна накіроўваць у камадзіроўкі, у тым ліку замежныя, — каб вопыту набіраліся. Як вырошчваць спаржавую фасолю, вучыліся, напрыклад, у Чыкага:

— Мы ствараем усе ўмовы для праяўлення творчай ініцыятывы і рознымі спосабамі людзей заахвочваем. У нас нават на планёрках заўсёды адбываецца творчы дыспут. Галоўнае — не аказваць ціск на спецыяліста, даваць яму магчымасць праявіць ініцыятыву. Чалавек перш за ўсё павінен працаваць сам над сабой. Трэба знаходзіць час чытаць, вывучаць нешта новае. Дзякуй Богу, практычна ўсе мае спецыялісты пастаянна знаходзяцца ў пошуку.

НАПРЫКАНЦЫ ў нас з Аркадзем Тарасавічам заходзіць гутарка пра сям'ю і яе ролю ў выхаванні. Ён узгадвае свайго бацьку Тараса Сцяпанавіча, які быў першым трактарыстам у калгасе імя Леніна тады Уваравіцкага (цяпер Буда-Кашалёўскага) раёна. Гэта ён прывучыў прачынацца на досвітку, каб больш паспець зрабіць. Бацька браў хлопчыка ў поле памагатым:

— Мы ж раслі, як усе пасляваенныя дзеці. У дзевяць гадоў я працаваў у калгасе. Бульбу аралі, палолі, траву касілі. Не толькі я, усе падлеткі так працавалі. У гаспадарцы ўсе мы зараблялі тады не грошы, а «працадні». У школьным сачыненні шмат гадоў таму агучыў сваю мару: быць старшынёй. Атрымалася. Прафесійную дзейнасць я пачынаў інструктарам, а потым сакратаром райкама камсамола ва Уваравічах, а Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію закончыў завочна ў 1963 годзе.

Тады ж, у юнацтве, Аркадзь Кобрусеў узначаліў адзін з маладзёжных камсамольскіх атрадаў Гомельшчыны, які быў накіраваны на ўборку ўраджаю на цаліне. Дарэчы, 600 чалавек было ў атрадзе. Медаль «За засваенне цалінных земляў» быў першай, але далёка не апошняй узнагародай.

— Мяне ўзнагароды заўсёды натхнялі на новыя дасягненні. Гэта важна — ведаць і адчуваць, што ты на нешта здольны. Між іншым, ва ўсіх маіх узнагародах вялікая заслуга жонкі, — гаворыць Аркадзь Тарасавіч. — Прыходзіш дадому вельмі позна, але заўсёды адчуваеш утульнасць. Адчуваеш, што цябе чакаюць. Марыя Аляксееўна — мой сапраўдны тыл.

**«Галоўнае — не аказваць ціск на спецыяліста, даваць яму магчымасць праявіць ініцыятыву».**

Кобрусеў адначае, што дзеці бачылі яго не так многа, як хацелася: праца забірала ўвесь час. Куды больш сынам і дачкой займалася жонка. Але разам яны лічылі, што галоўнае правіла выхавання — пастаянная занятасць. Таму сын Аляксандр быў аддадзены ў спартыўную школу, дзе і займаўся ўпарта плаваннем:

— У яго ж хвіліны свабоднай не было, ён пастаянна быў заняты. Спадзяюся, што Саша і Ларыса нам з жонкай удзячны за працавітасць, якую мы імкнуліся ў іх выхаваць.

**Неверагодны прагай да ўсяго новага здзіўляе Аркадзь Кобрусеў усіх, хто побач. Ён знаходзіць «разынкі» нават там, дзе іншыя не бачаць. Яго галоўны дэвіз — не спыняцца і ісці наперад.**

**— Трэба бачыць жыццё такім, якое яно ёсць. І самае галоўнае — ніколі не задавальняцца дасягнутымі поспехамі.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *astashkevich@zviazda.by*

**Фота аўтара**

■ Да ведама

### ХТО НЕ БУДЗЕ ПЛАЦІЦЬ ЗА ПЛАТНЫЯ ДАРОГІ?

**Указам Прэзідэнта Беларусі ўнесены змяненні ў сістэму збірання платы за праезд па платных дарогах.**

Ім прадугледжана распрацоўка і зацвярджэнне новага Палажэння аб выдачы прадаўцом (юрыдычнай асобай ці індывідуальным прадпрымальнікам) часовых нумарных знакаў пры продажы аўтамабіляў, увезеных у Беларусь для рэалізацыі. Пры гэтым такія транспартныя сродкі масай да 3,5 тоны будуць вызваляцца ад платы за праезд па платных дарогах пры дастаўцы іх да месца дзяржаўнай рэгістрацыі, патлумачылі ў прэс-цэнтры Міністэрства транспарту і камунікацый.

Таксама прадугледжана вызваленне ад платы за праезд набытых і ўвезеных у Рэспубліку Беларусь фізічнымі асобамі транспартных сродкаў, не зарэгістраваных на тэрыторыі дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай не большай за 3,5 тоны і прычэпаў, якія яны буксіруюць, цягам 10 дзён з моманту ўвозу (ці з моманту набыцця, калі яны ўвозяцца з тэрыторыі іншых дзяржаў — членаў ЕАЭС).

Указам замацоўваецца вызваленне ад платы за праезд па платных дарогах асоб, якія выкарыстоўваюць транспартныя сродкі, зарэгістраваныя на тэрыторыі Данецкай і Луганскай абласцей Украіны, з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай не большай за 3,5 тоны і прычэпы, што яны буксіруюць. Пералік асоб, вызваленых ад платы, будзе вызначацца па месцы рэгістрацыі транспартнага сродку карыстальніка платных дарог у Данецкай і Луганскай абласцях па рэгістрацыйных знаках і пасведчанні рэгістрацыі. Гэтая катэгорыя грамадзян Украіны, якая трапіла ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, будзе вызваляцца ад платы за праезд па платных дарогах і ў павялічаным памеры.

■ Здарэнне

### РАБОЧАГА ЗАСЫПАЛА ГРУНТАМ

**Пры правядзенні земляных работ на сталічнай вуліцы Скарыны адбыўся абвал грунту. Пад зямлёй аказаўся чалавек.**

Здарэнне мела месца бліжэй да вечара на тэрыторыі будучай пляцоўкі, дзе вяліся работы па ўкладцы каналізацыі ў траншэі глыбінёй тры метры. У нейкі момант зямля абвалілася на рабочага 1963 года нараджэння. Сталічныя выратавальнікі мусілі даставаць пацярпелага пры дапамозе шанцавага інструмента. З дыягназам «сіндром сціскання, клінічная смерць» яго даставілі ў бальніцу. Як стала вядома пазней, рабочы скануў. Прычына здарэння высвятляецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*